Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2018-04-13

# ПА СЛЯДАХ КНІГАВЫДАЎЦОЎ

Кожны з пачынальнікаў гэтай справы працаваў на сваю зямлю. І як Францыск Скарына ўславіў Полацк, так Спірыдон Собаль развіваў асвету, пакінуўшы след у гісторыі Магілёўшчыны і ўсёй Беларусі, якую ён узбагачаў выданнямі кніг. Пра гэта распавядае часовая экспазіцыя «Беларускі друкар Спірыдон Собаль» у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Беларускі асветнік нарадзіўся каля 1580—1590 гг. у Магілёве ў сям'і бурмістра. Першыя спробы надрукаваць кнігі ажыццявіў у Кіеве. Адтуль прывёз абсталяванне для друкарскай справы. Заснаваў першыя друкарні ў Куцейне, Буйнічах, Магілёве. Спірыдон Собаль выдаў адзін з першых на землях сучаснай Беларусі «Буквар». Дакладна вядома, што выданне першых кніг на Магілёўшчыне звязана менавіта з дзейнасцю гэтага выбітнага беларускага дзеяча.

Экспазіцыя дае магчымасць уявіць кнігадрукарскі шлях Спірыдона Собаля. Можна даведацца пра «Букварь сиречь, начало учения детем, начинающим чтению извыкати». А таксама можна пазнаёміцца з рэдкімі выданнямі XVII ст. з друкарні Спірыдона Собаля ў Кіеве, Магілёўскага брацкага манастыра, Богаяўленскай друкарні Спірыдона Собаля ў Куцейне…

Да ажыццяўлення гэтага праекта ў Мінску далучыўся Музей гісторыі Магілёва. Падтрымалі яго Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі і Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.

**Марыя АСІПЕНКА**

Марыя Асіпенка. Па слядах кнігавыдаўцоў